**Шапавалава, А.** Жыве памяць / А. Шапавалава // Пастаўскі край. — 2004. — 10 сак. — С. 3.

# ЖЫВЕ ПАМЯЦЬ

15 гадоў назад 15 лютага закончылася вайна ў Афганістане. У гэты дзень апошні савецкі салдат пакінуў шматпакутную афганскую зямлю, шчодра паліткую крывёй нашых суайчыннікаў. З вывадам адтуль савецкіх войск з палёгкай уздыхнулі не толькі воіны-інтэранцыяналісты, якім больш не трэба рызыкаваць жыццём, выконваючы свой абавязак перад Радзімай, і іх родныя, але і ўсе жыхары СССР – з гэтага моманту адпала неабходнасць адпраўляць у вогненнае пекла дарагіх ім людзей.

Зараз многае можна пачуць пра гэту вайну. Крытыкі, разважаючы пра бессэнсоўнасць, часата наносяць маральны ўдар тым, хто быў у Афганістане. Але большасць нашых грамадзян з павагай ставіцца да тых падзей і удзельнікаў. Пра гэта і мы, вучні і настаўнікі СШ № 2, – гаварыла, адкрываючы мерапрыемства, прысвечанае 15-годдзю выводу войск з афганістана, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Р. Н. Ластоўская.

Праходзіла яно 21 лютага ў школьным музеі, дзе не так даўно з'явіўся раздзел пра воінаў-інтэрнацыяналістаў. На мерапрыемства былі запрошаны прадстаўнікі розных пакаленняў: аетэраны Вялікай айчыннай вайны, былыя «афганцы», якія зараз жывуці і працуюць на Пастаўшчыне, супрацоўнік райваенкамата, родныя нашых землякоў, загінуўшых у Афганістане і Сірыі – сястра Радзівона Мішуты, маці Аляксандра Урбеля і Сяргея Галяка, а таксама плменніца апошняга. Не змагла прыехаць на сустрэчу ў школу толькі мама Міхаіла Лапко, якая жыве ў Станелевічах.

Галоўным чынам для «афганцаў» і іх блізкіх гучала экскурсія, якую правялі вучаніцы 9 «Г» класа Вераніка Муха і Вольга Рудая. Дзяўчынкі настолька пранікнёна расказвалі пра кароткі жыццёвы лёс застаўшыхся назаўсёды маладымі хлопцамі. Што многія з прысутных не маглі стрымаць слёз. Не забыты стваральніцай музея Р. Н. Ластоўскай і вучнямі школы і іншыя воіны-інтэрнацыяналісты. Фатаздымкі многіх з іх разам з узнагародамі, асабістымі рэчамі загтнуўшых сяброў, пісьмамі, рознымі дакументамі знаходзяцца ў экспазіцыі «афганскага» раздзела. Узгадалі пра іх у сваім расказе і юныя экскурсаводы.

Ну, а затым слова было прадстаўлена гасцям. Ад імя ўсіх, каму давялося прайсці вогненнымі дарогамі Афганістана, інжынер Пастаўскага лясгаса А. М. Клянцэвіч падзякаваў Рэгіне Норбертаўне і вучням СШ № 2 за памяць пра іх.  Ён адзначыў, што ў раздзеле сабраны багаты і цікавы матэрыял і асабліва яго вельмі крануў пачуты расказ. Сваё меркаванне пра афганскую вайну выказалі ветэраны Вялікай Айчыннай І. В. Гецьман і М. А. Полех. Марыя Аляксандраўна, у прыватнасці падкрэсліла: «Афганцам» было складаней, чым нам: мы змагаліся на сваёй зямлі, а яны на чужбіне. І жахі, якія перажылі, яны будуць памятаць усё жыццё. Радуе, што пра хлопцаў, і жывых, і мёртвых, не забываюць тыя, каго не зачапіла вайна. І гэта трэба рабіць». Быў салідарны з папярэднімі выступаўшымі і начальнік аддзялення тэрытарыяльнай абаронны райваенкамата капітан І. В. Мазалаў.

Увазе усіх, хто прыйшоў у той дзень у школу, быў прапанаваны таксама спектакль па матэрыялах музея, сцэнарый якога напісала Р. Н. Ластоўская. Падчас яго госці «сустрэліся» злюдзьмі, якія некалі жылі і рпацавалі на Пастаўшчыне, праслаўлялі і змагаліся за сваю Радзіму. Закончылася ж мерапрыемства сяброўскай гутаркай і чаяпіццем за салодкім сталом.

**А. Шапавалава**